


Урэнгой, Ямбург, Мядзведжае. Перспектыўны раён здабычы газу — п-аў Ямал. Нафтаперапрацоўка ў Цюмені, Табольску, газаперапр. з-ды на базе спадарожнага нафтавага газу ў Мураўленцы, Вынгапуры, Наябрску, Ніжнявартаўску. Вытв-сць электраэнергіі 64,8 млрд. кВт·гадз (1999) на ДРЭС (Сургуцкая 1 і 2, Ніжнявартаўская, Урэнгойская) і ЦЭЦ (Цюменская і інш.). Машынабудаванне і металаапрацоўка (акумулятарныя батарэі, дрэваапр. і металарэзныя станкі, нафтаапаратура, буравое, геолагаразведачнае абсталяванне і інструменты, с.-г. машыны, рачныя судны, суднарамонт), хім. (сінт. каўчук, смолы) і хім.-фармацэўтычная, лясная і дрэваапр. (фанера, драўнянастружкавыя пліты, мэбля), лёгкая (аўчынна-футравая, тэкст., абутковая, дывановая), харч., у т.л. рыбная прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. С.-г. ўгоддзі займаюць 3374,1 тыс. га, у т.л. ворныя землі 1504,2 тыс. га. Вырошчваюць збожжавыя (жыта, пшаніца, авёс, ячмень), тэхн. і кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Больш за 64% кошту с.-г. прадукцыі прыпадае на малочна-мясную жывёлагадоўлю. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз, птушак; на Пн — аленегадоўля. Зверагадоўля (серабрыста-чорны ліс, пясец, норка). Пушны промысел (собаль, пясец, андатра). Даўж. чыгунак 2451 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 9361 км (2000). Гал. чыгункі Цюмень—Табольск—Сургут—Наябрск—Новы Урэнгой, Цюмень—Омск, Транссібірская магістраль (на Пд); аўтадарогі Цюмень—Табольск, Цюмень—Ішым. Суднаходства па рэках Об, Іртыш, Табол, Тура і інш. 14 аэрапортаў. Магутная сетка трубаправодаў. Нафтаправоды Сургут—Наваполацк, Усць-Балык—Курган—Альмецьеўск, Ніжнявартаўск—Самара—Унеча—Мазыр—Брэст—Еўропа, газаправоды Урэнгой—Масква, Урэнгой—Памары—Ужгарад; прадуктаправод Усць-Балык—Табольск. Бальнеагразевы курорт Вял. Тараскуль. *В.М.Корзун.*

**ЦЮМЕНЬ**, горад, цэнтр Цюменскай вобл. Расіі. Ц. — першы рас. горад у Сібіры, засн. ў 1586 каля руін тат. г. Чымгі-Тура (вядомы з 14 ст.). 500,2 тыс. ж. (2001). Чыг. вузел. Порт на р. Тура. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (судны, рухавікі, акумулятары, станкі, нафтаапаратура, буравое і геолага-разведачнае абсталяванне, мед. абсталяванне і інструменты), дрэ-



**Цюмень**. Краязнаўчы музей.

ваапр., хім.-фармацэўтычная, лёгкая (тэкст., абутковая, дывановая), харч. (мясная, малочная, рыбная); вытв-сць буд. матэрыялаў. ЦЭЦ. Ун-т, мед. акадэмія, 4 ін-ты. Тэатры: драм. і лялек. Філармонія. Цырк. Музеі: краязнаўчы (з 1879), геалогіі, нафты і газу, штаб-кватэра В.К.*Блюхера*, карцінная галерэя. Арх. помнікі: Троіцкі сабор (1709—15), Петрапаўлаўская царква (1755; цяпер Музей гісторыі горада) і інш.

**ЦЮНГ**, рака, левы прыток Вілюя, у Рэспубліцы Саха (Якуція), у Расіі. Даўж. 1092 км, пл. бас. 49,8 тыс. км$^2$. Цячэ ў межах Сярэднесіб. пласкагор'я і Цэнтральнаякуцкай раўніны. Асн. прытокі злева — Чымідыкян і Джыпа. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 180 м$^3$/с. Ледастаў з сярэдзіны кастр. да 2-й пал. мая. Суднаходная на 273 км ад вусця.

**ЦЮНТ** (Zündt, Zinck, Zintt, Zyndler, Zynndt, Zynnth) Маціс (Мацей; 1498?—25.2.1572), нямецкі гравёр, ювелір. Працаваў у Нюрнбергу. Выканаў вял. коль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

касць гравюр (геагр. карты, партрэты гіст. асоб, сцэны значных паліт. падзей, віды гарадоў, алегорыі па матывах міфалагічных і біблейскіх сюжэтаў, гербы, экслібрысы і інш.). У 1567—68 з малюнка І.Адэльгаўзера выканаў гравюру, якая ілюструе прыём у Гродне Жыгімонтам II Аўгустам паслоў Івана IV (т.зв. гравюра Гродна). Гравюра (памеры 103 х 35,3 см) мае панарамную выяву забудовы аднаго з найбуйнейшых бел. гарадоў сярэдзіны 16 ст., адлюстроўвае некат. дэталі гар. побыту. У 17—18 ст. з яе неаднаразова рабілі паўторы (менш падрабязныя ў параўнанні з арыгіналам). *Р.В.Баравы, А.А.Трусаў.*

**ЦЮ́ПА** Вячаслаў Алегавіч (н. 10.1.1955, Душанбе), расійскі і бел. рэжысёр. Вучыўся ў Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі (1969—71), скончыў Муз. вучылішча імя Гнесіных (1976), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1981). З 1981 рэжысёр-пастаноўшчык Растоўскага т-ра муз. камедыі. З 1984 в.а. гал. рэжысёра, з 1987 гал. рэжысёр Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі, у 1992—98 рэжысёр-пастаноўшчык Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Яго работы вызначаюцца рэжысёрскай фантазіяй, паэтычна-рамант. светаадчуваннем, пошукам новых выразных сродкаў. У т-ры муз. камедыі паставіў «Сірано» С.Пажлакова (1984), «Гуляем у прынца і жабрака» А.Журбіна, «Сільва» І.Кальмана (абедзве 1986), «Клоп» У.Дашкевіча (1988), «Хэло, Долі!» Дж.Германа (1992), «Халопка» М.Стрэльнікава (1994), «Чараўнік» Д.Рансуінка (1992, Дзіцячы муз. т-р «Казка»); у Нац. акад. т-ры оперы Беларусі «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана (1989, Дзярж. прэмія Беларусі 1990), «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» Р.Вардоцкага (1989, канцэртная версія), «Кармэн» Ж.Бізэ (1990), «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава (1992), «Іаланта» П.Чайкоўскага (1993), «Сельскі гонар» П.Масканьі (1996). З 1998 працуе ў Расіі.

*Літ.*: Брылон В. Слава для мяне не самамэта // Мастацтва Беларусі. 1991. № 8. *В.Г.Брылон.*

**ЦЮРГО́** (Turgot) Ан Рабер Жак (10.5.1727, Парыж — 20.3.1781), французскі дзярж. дзеяч, філосаф, эканаміст. Скончыў тэалагічны ф-т Сарбоны, але адмовіўся ад духоўнай кар'еры. У 1761—74 інтэндант у Ліможы. У 1774—76 ген. кантралёр фінансаў (міністр фінансаў, гандлю і грамадскіх работ); ажыццявіў шэраг рэформ, якія лібералізавалі эканам. жыццё Францыі (выдаў дэкрэт пра свабодны гандаль хлебам, у 1766 скасаваў дарожныя павіннасці і цэхавую арганізацыю). У працы «Размова пра ўсеагульную гісторыю» (1750) распрацаваў філасофію гісторыі, у цэнтры якой аналіз прагрэсу ў розных галінах грамадскага жыцця і законаў, якія імі кіруюць. Гэтыя ідэі Ц. развіты ў працах М.Ж.Кандарсэ і К.А.Сен-Сімона. У эканам. тэорыі Ц. за аснову ўзяў канцэпцыю *фізіякратаў* чыстага с.-г. прадукту і фізіякратычны падзел на класы. Адмаўляў ідэю натуральнага парадку і стаяў на пазіцыях асабістага інтарэсу, з якога выводзіў пастулат свабоднай канкурэнцыі; прадказаў ідэю гарманізуючай дзейнасці рынку А.Сміта. Зрабіў пэўны ўклад у развіццё тэорыі грошай. Асн. яго праца «Роздумы пра стварэнне і размеркаванне багаццяў» (1766). Аўтар артыкулаў у «Энцыклапедыі» Д.Дзідро і Ж.Л.Д'Аламбера.

*Тв.*: Рус. пер. — Избранные философские произведения. М., 1937; Избранные экономические произведения. М., 1961. *Н.К.Мазоўка.*

**ЦЮРКАЛО́ГІЯ**, сукупнасць гуманітарных навук, што вывучаюць мовы, этнаграфію, гісторыю, л-ру, фальклор, культуру народаў, якія гавораць на *цюркскіх мовах*. Зарадзілася ў 15—16 ст. з натуральнай цікавасці еўрапейцаў да тур. заваёўнікаў, таму напачатку яе асн. кірункам было вывучэнне Асманскай імперыі і тур. мовы. Сістэм. даследаванні ў Зах. Еўропе пачаў аўстр. ўсходазнавец і дыпламат І.Гамер-Пургшталь (1774—1856), у Расіі (з 2-й пал. 18 ст.) — І.Гіганаў і С.Хальфін.

Рас. Ц. ў 19 — пач. 20 ст. развівалася комплексна: вывучэнне мовы, л-ры, гіст. помнікаў, нумізматыкі (працы М.М.Казем-бека, Ф.Я.Корша, В.В.*Радлава* і інш.). У сав. перыяд у галіне Ц. працавалі В.У.Бартальд, Я.Э.Бертэльс, У.А.Гардлеўскі, Т.Г.Кезма, М.Я.*Мар*, І.А.*Арбелі* і інш.; з 1970-х г. Ц. засяроджана ў Ін-це ўсходазнаўства АН СССР (з 1991 — Рас. АН). Сярод даследчыкаў зах. краін пытанні Ц. вывучалі Х.Боўэн, Б.Льюіс (Вялікабрытанія), Ф.Бабінгер, Г.Яшке (Германія), Ж.Дэні, М.Мала (Францыя), Дж.В.Беркер, Р.Х.Дэвісан (ЗША) і інш.

На Беларусі цюркалагічныя даследаванні традыцыйна засяроджаны на вывучэнні гісторыі і культуры бел. *татараў* (працы Л.К.Крычынскага, А.В.*Мухлінскага*, Дж.Александровіча, А.І.Дубінскага, С.У.Думіна, І.Б.Канапацкага, А.І.*Смолка*, А.П.*Грыцкевіча*, В.І.Несцяровіча, Я.А.Якубоўскага і інш.).

**ЦЮРКІ́ЗМ**, слова, запазычанае з *цюркскіх моў*.

Частка лексічных сродкаў цюркскага паходжання захавалася ў бел. мове ад стараж.-рус. эпохі: «арда», «атаман», «баскак», «басурман», «бісер», «ярлык». Большасць Ц. запазычана ў перыяд самаст. развіцця старабел. мовы (14—17 ст.) у выніку гандл., дыпламат. і інш. кантактаў бел. насельніцтва з цюркскімі народамі (у асн. з татарамі, якія перасяляліся на Беларусь пераважна з Крыма) і праз пасрэдніцтва суседніх моў — рус., укр. і польскай. З 15—17 ст. у бел. мове ўжываюцца Ц. быт. характару: «аршын», «атлас», «барсук», «барыш», «буланы», «бурка», «казак», «капшук», «караван», «каўпак», «кафтан», «кілім», «кішэнь», «кумыс», «кутас», «магарыч», «мячэць», «нагайка», «саф'ян», «султан», «тафта», «харч», «чапрак», «шаравары» і інш. Слоўнікі бел. мовы фіксуюць шэраг устарэлых Ц.: «апанча», «армяк», «казна», «камка», «кісцень», «таф'я». Некаторыя Ц. перайшлі ў разрад *гістарызмаў*: «бунчук», «есаул», «калчан», «ківер», «мурза», «сагайдак», «тамга», «янычар», «ясыр». У сучасную бел. мову Ц. запазычваюцца праз рус. мову. Гэта пераважна экзатызмы (гл. *Экзатычная лексіка*): «акын», «бархан», «басмач», «гюрза», «калым», «кізіл», «кішлак», «кунак», «саксаул».

*Літ.*: Булыка А.М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV—XVIII стст. Мн., 1980. *А.М.Булыка.*

**ЦЮ́РКСКІ КАГАНА́Т**, дзяржава племяннога саюза цюркаў у 552—745 на тэр. Цэнтр. і Сярэдняй Азіі, Паўн. Кітая. На чале дзяржавы стаяў *каган*. У 545 цюркі разграмілі уйгурскія плямёны, у 551 — жужан. У 555 пад уладай цюркаў былі ўсе народы Цэнтр. Азіі, у т.л. кідані ў Зах. Маньчжурыі і енісейскія кіргізы. У 560-я г. яны перамаглі Эфталітаў дзяржаву, у 570-я г. ў залежнасць ад Ц.к. трапілі паўн.-кіт. дзяржавы Чжоў і Ці. У саюзе з Візантыяй Ц.к. пачаў вайну супраць Ірана за кантроль над *Вялікім шаўковым шляхам*; у 571 мяжа паміж імі праходзіла па р. Амудар'я, а ў 588—589 да Ц.к. далучаны і некаторыя вобласці на зах. беразе Амудар'і. У 576 цюркі захапілі Баспор (Керч), у 581 узялі ў аблогу Херсанес Таўрычаскі. У канцы 6 ст. з-за міжусобіц і паліт. крызісу Ц.к. распаўся на Ўсх. (цэнтр.-азіяцкую) і зах. (сярэднеазіяцкую) часткі. Асн. землі Зах. Ц.к. ў 658—659 акупіраваны кіт. войскамі. У 704 Зах. Ц.к. вызваліўся ад кіт. залежнасці, але напады суседзяў і ўнутр. супярэчнасці прывялі яго да гібелі ў 740. Усх. Ц.к. у 609—619 аднавіў свой уплыў у Цэнтр. Азіі, але пасля паражэння ў 630 у вайне трапіў у залежнасць ад Кітая. У 691—716 на кароткі час ён пашырыў сваю тэр. ад Маньчжурыі да Сырдар'і; цюркскія атрады дайшлі да Самарканда. У 712—713 ён пацярпеў паражэнне ў бітвах з арабамі. Усх. Ц.к. распаўся на ўдзельныя княствы, а на яго месцы ўзнік Уйгурскі каганат (745—840).

**ЦЮ́РКСКІЯ МО́ВЫ**, група роднасных моў, пашыраных у Азіі і Усх. Еўропе. Разам з *тунгуса-маньчжурскімі мовамі* і *мангольскімі мовамі* ўтвараюць сям'ю *алтайскіх моў*. Паводле генеалагічнай класіфікацыі вылучаюць 6 груп. 4 групы належаць да заходнегунскай галіны: булгарская (мёртвыя — булгарская і хазарская мовы, жывая *чувашская мова*), агузская (мёртвая печанежская, жывыя — *турэцкая мова*, *азербайджанская мова*, *туркменская мова*, гагаузская і інш.), кыпчакская (мёртвыя — палавецкая, мова бел. татар, жывыя — *татарская мова*, *башкірская мова*, *казахская мова*, караімская, кумыкская, карачаева-балкарская, нагайская, каракалпакская і інш.), карлуцкая (мёртвая чагатайская, жывыя — *узбекская мова*, *уйгурская мова* і інш.). 2 групы належаць да ўсх.-гунскай галіны: уйгура-агузская (мёртвая стараж.-уйгурская, жывыя — *якуцкая мова*, тувінская, хакаская і інш.), кіргізска-кыпчакская (мёртвая стараж.-кіргізская, жывыя — *кіргізская мова*, алтайская). Ц.м. уласцівы: у фанетыцы — сінгарманізм, трохсastаўны склад (зычны — галосны — зычны), багатая сістэма зычных; у марфалогіі — прыметнік марфалагічна ма-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ